Зацвярджаю
Начальнік аддзела адукацыі,
спорту і турызму
І.В. Асташэвіч
“ “ кастрычніка 2017 г.

**І этап рэспубліканскай алімпіяды
па беларускай мове і літаратуры**

**Тэкст для водгуку**

**11 клас**

## Выбар

З усіх дарог я выбіраю тую,
Што прывядзе мяне ў радзімы край,
У лес, на рэчку, ніву залатую,
У родны дом, дзе напамін пра рай.

З усіх работ я выбіраю тую,
Дзе мова ўваскрасае з небыцця,
І я яе, пакутніцу, ратую
І пешчу, нібы хворае дзіця.

Сяброўку сабе выбрала б таксама,
Што радуецца з радасцяў маіх,
Бядуе з бедаў і гаворыць прама,
А не маной ліслівай тупіць слых.

Мужчыну і любоў (несумяшчальна?)
Я выбрала б , як два ў адным, усё ж.
Агонь кахання цудаачышчальны,
Яшчэ мо нейкіх дробязяў на грош.

Сама сябе руйную і ствараю,
Навучаная - выбар мой за мной!
Ды не…з дароў Гасподніх выбіраю
Бясцэннае. Але якой цаной?!

*Людміла Кебіч.*